ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 11(985) | АЎТОРАК, 20 чэрвеня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

*Словы на развітанне*

## МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ XXI СТАГОДДЗЯ

Дарагія нашы выпускнікі!

Вось і закончыліся для вас самыя запамінальныя студэнцкія гады. Наперадзе — доўгі шлях у самастойным працоўным жыцці. Атрымаўшы дыпломы аб заканчэнні Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, вы здолееце на практыцы выкарыстаць атрыманыя тут фундаментальныя веды.

Знамянальна, што вышэйшую адукацыю вы атрымалі на зыходзе самага насычанага на гістарычныя падзеі XX стагоддзя і маладымі спецыялістамі ўступаеце ў новыя стагоддзе і тысячагоддзе. Гэта запатрабуе ад вас яшчэ большага прафесіянальнага напружання, творчага падыходу да вырашэння кожнай вытворчай і грамадскай задачы. Будзьце гатовымі да пераадолення самых складаных выпрабаванняў.

У наш універсітэт вы паступалі юнакамі і дзяўчатамі, а заканчваеце яго высокаадукаванымі сталымі людзьмі. Многія знайшлі тут сваё сапраўднае каханне, стварылі трывалыя маладыя сем'і, выявілі і развілі асабістыя здольнасці і таленты. І гэта надае яшчэ больш аптымізму і ўпэўненасці на будучыню.

Дзе б вам не давялося жыць і працаваць, ніколі не забывайце сваю alma mater, падтрымлівайце з ёю цесныя сувязі, добрым словам успамінайце выкладчыкаў, якія шчодра перадавалі вам свае багатыя веды і жыццёвы вопыт. Лічыце сваім пачэсным абавязкам шырокую прапаганду ГДУ як вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся.

Шчаслівага вам шляху ў самастойнае працоўнае жыццё!

**РЭКТАРАТ, ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА.**

**Імі ганарыцца універсітэт**

## ЧАС САМАСЦВЯРДЖЭННЯ

Яшчэ адзін навучальны год завершаны. Для Ірыны Асянінай, студэнткі III-га курса эканамічнага факультэта, ён як заўсёды быў паспяховым. Дзяўчына пацвердзіла сваімі выдатнымі ведамі, актыўнасцю ў навукова-даследчай рабоце ганаровае права называцца стыпендыяткай імя нашага выдатнага земляка гісторыка, этнографа, фалькларыста і эканаміста М.В.Доўнар-Запольскага.

Ірына добра разумее, што поспех сам па сабе не прыходзіць. Патрэбна штодзённая праца, мэтанакіраванасць і настойлівасць. Гэта ўсё ў яе ёсць, дзякуючы чаму з І-га курса — яна выдатніца вучобы і актыўная ўдзельніца НДРС. Пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры эканамічных тэорый дацэнта Б.У.Сарвірава яна плённа распрацоўвае тэму аб пабудове рынучных адносін у Беларусі. Са сваімі грунтоўнымі навуковымі дакладамі І.Асяніна выступала на студэнцкіх канферэнцыях не толькі ў нашым універсітэце, але і ў сталіцы, у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце. Ёсць у яе і шэраг публікацый у выдадзеных зборніках тэзісаў навуковых канферэнцый рознага ўзроўню.

Ірына паспяхова займаецца і ў Франка-Беларускім інстытуце кіравання, два разы давялося ёй пабываць разам з аднакурснікамі ў Клермон-Феране.



Вера ў свае сілы, рашучасць, самастойнасць дапамаглі ёй яшчэ ў школьныя гады закончыць сваю сярэднюю адукацыю ў ЗША, штаце Пенсельванія. Туды яна разам з іншымі вучнямі гомельскіх школ трапіла пасля вытрыманага спецыяльнага тэсціравання на веданне англійскай мовы. Там, у амерыканскай школе, яна выбрала для сябе такія прадметы для вывучэння, як бухгалтарскі ўлік, асновы інфарматыкі, французская мова, гісторыя ўрада ЗША, англійская літаратура. З поспехам скончыла вучобу і вярнулася ў Беларусь. Пасля вучобы за акіянам дзяўчына змагла паглядзець па-новаму на некаторыя рэчы ў нашым жыцці.

...Цяпер студэнцкія гады для І.Асянінай — час развіцця здольнасцей і самасцвярджэння.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: І.Асяніна.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

*ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі і студэнты горача віншуюць СІЛЬЧАНКА Ірыну Уладзіміраўну з кафедры псіхалогіі, СВІРЫДАВУ Валянціну Уладзіміраўну і КУПРЭЕВА Міхаіла Пятровіча з кафедры агульнай фізікі з прысваеннем ім Прэзідыумам БелВАКа вучонага звання дацэнт па адпаведных спецыяльнасцях.*

## АДКРЫТА НОВАЯ КАФЕДРА

З мэтай павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, канцэнтрацыі на адной кафедры спартыўна-педагагічных дысцыплін, якія выкладаюцца на факультэце фізічнай культуры, а таксама з улікам рэкамендацый атэстацыйнай камісіі Дзяржаўнай інспекцыі навучальных устаноў у снежні 1998 года і на падставе рашэння Савета ГДУ ад 27 красавіка г.г. загадам па універсітэту з 1-га чэрвеня на факультэце фізічнай культуры адкрыта кафедра спартыўных дысцыплін. Яе ўзначальвае кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Зайцаў Барыс Макаравіч.

## НОВАЕ НАВУКОВАЕ ВЫДАННЕ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

***Без перабольшання можна сказаць, што май 2000 года стаў гістарычным для Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. У гэтым месяцы выйшаў у свет першы нумар навукова-тэарэтычнага часопіса "Весці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны".***

Сваім нараджэннем новае выданне, якое разлічана на шырокія колы навуковай грамадскасці і публікацыю артыкулаў на беларускай, рускай і англійскай мовах, абавязана перш за ўсё энергіі і настойлівасці вядомых вучоных нашай краіны: члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара Л.А.Шамяткова, які з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса, рэктара універсітэта, прафесара М.В.Селькіна, прарэктара па навуковай рабоце, прафесара Д.Р.Ліна, выпускаючага рэдактара, прафесара В.С.Манахава. Сваю лепту ўнеслі розныя універсітэцкія службы і, канешне ж, аўтары артыкулаў. Таму новы часопіс — гэта здабытак сумесных намаганняў і рэдакцыйнай калегіі, і калектыву універсітэта ў цэлым.

Адкрываецца нумар зваротам галоўнага рэдактара да чытачоў. У невялікім па аб'ёме артыкуле адлюстраваны асноўныя вехі гісторыі універсітэта. Сярод іх — рашэнне ўрада Беларусі ад 1929 года аб адкрыцці ў Гомелі педагагічнага інстытута, пастанова Савета Міністраў Беларусі ад 1969 года аб пераўтварэнні Гомельскага педагагічнага інстытута ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт і прысваенне яму ў 1988 годзе імя выдатнага дзеяча эпохі Адраджэння, усходнеславянскага і беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

Поруч з гэтымі знамянальнымі датамі асабліва адзначаны дзень 27 кастрычніка 1999 года, калі Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку прыняў рашэнне аб выпуску часопіса "Весці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны", што з'явілася і вынікам прызнання навуковых дасягненняў вучоных вядучай навучальнай установы Гомельскага Палесся. Ва ўступным рэдактарскім артыкуле выкладаецца і канцэпцыя новага рэспубліканскага навукова-тэарэтычнага выдання, асобныя нумары якога будуць прысвечаны як праблемам пэўных раздзелаў навукі, так і агульнатэматычным, пачнуць адлюстроўваць на сваіх старонках матэрыялы міжнародных навуковых канферэнцый, што праводзяцца ва універсітэце.

У аснову першага нумара былі пакладзены даследаванні ў галіне алгебры. І гэта не выпадкова. Бо Гомельская алгебраічная школа пад кіраўніцтвам прафесара Л.А.Шамяткова па праву прызнана і ў нашай рэспубліцы, і за яе межамі, прычым у дзяржавах з найвышэйшым узроўнем фундаментальнай і прыкладной навукі. Так, з навуковымі працамі прафесара Л.А.Шамяткова можна азнаёміцца ў бібліятэцы Кангрэса ЗША, прафесар М.В.Селькін яшчэ ў пачатку 90-х гадоў з годнасцю прадстаўляў беларускую навуку ў Японіі. Вучоныя-алгебраісты Гомельскай школы прымаюць актыўны ўдзел у распрацоўцы міжнародных навуковых праграм і ў рабоце канферэнцый.

Разам з работамі вучоных універсітэта (Л.А.Шамяткова, С.Ф.Каморнікава, Ю.В.Краўчанкі, В.С.Манахава, В.Р.Сафонава, У.М.Семенчука і інш.) у нумары апублікаваны і артыкулы прадстаўнікоў іншых навуковых цэнтраў Беларусі, Расіі і Украіны. У прыватнасці, гэта вынікі даследаванняў прафесара Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава М.Ц.Вараб'ёва, прафесараў Н.М.Губарэні і В.В.Кірычэнкі, дацэнта У.С.Равіцкай з Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, кандыдата фізіка-матэматычных навук С.А.Даўжэнкі з Бранскага дзяржпедуніверсітэта імя акадэміка І.Г.Пятроўскага, дацэнта БелДУТа Т.І.Васільевай. Маладое пакаленне міжнароднай навукі прадстаўляе А.Ф.Аль-Дабабсех (Іарданія), выпускнік Данецкага дзяржаўнага універсітэта, а зараз аспірант БелДУТа.

Такая шырокая "геаграфія" аўтарскіх артыкулаў сведчыць аб высокім аўтарытэце Гомельскай алгебраічнай школы, што, у сваю чаргу, садзейнічала адпаведнаму навуковаму ўзроўню першага нумара новага часопіса. І ў гэтым сэнсе "першы блін" не аказаўся комам. Думаецца, што і наступныя нумары будуць трымаць высокую марку айчыннай навукі. Упэўненасць у гэтым надаюць матэрыялы па праблемах літаратуразнаўства і мовазнаўства, якія ўжо ёсць у рэдакцыйнай папцы і плануюцца да выдання ў бліжэйшай будучыні.

Нельга не нагадаць, што на зыходзе мая рэктарат ГДУ атрымаў ліст з універсітэта г.Мічыган (ЗША). Амерыканскія калегі просяць дасылаць наш часопіс у абмен на "Мічыганскі матэматычны часопіс".

Хочацца пажадаць новаму рэспубліканскаму навуковаму часопісу, што выдаецца на Гомельшчыне, поспехаў , а чытачам — радасці ад сустрэч з ім.

**С.ХАНЕНЯ, адказны сакратар "Вясцей Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны", дацэнт.**

## ДЫСЕРТАЦЫЮ АБАРАНІЛА КІТАЯНКА

Павялічваецца колькасць дысцыплін, па якіх пад кіраўніцтвам найбольш вопытных вучоных нашага універсітэта пішуць і паспяхова абараняюць дысертацыі маладыя даследчыкі з далёкага замежжа.

Упэўнены крок у навуку зрабіла і аспірантка загадчыка кафедры хіміі ГДУ кандыдата хімічных навук, дацэнта Ю.А.Праляскоўскага Цзян Сяо Хун з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Нядаўна яна вытрымала вельмі адказны экзамен на спецыялізаваным Савеце хімічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, дзе прынята рашэнне аб прысуджэнні ёй вучонай ступені кандыдата хімічных навук.

## ХРОНІКА

Кандыдат геаграфічных навук, дацэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю **МАЛАХАЎ** Алег Аляксеевіч загадам па універсітэту пераведзены на пасаду прарэктара па вучэбнай рабоце — дырэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

# НАВАТАР ПЕДАГАГІЧНАЙ НАВУКІ

## Да 80-годдзя акадэміка І.Ф.Харламава

Асяроддзе і ўмовы, у якіх фарміраваўся будучы вучоны, былі не са спрыяльных. Нарадзіўся ён у беднай сялянскай сям'і ў в.Шарпілаўка Гомельскага раёна, дзе наша Беларусь мяжуе з Украінай. З дзяцінства ўвабраў у сябе два моўныя дыялекты — беларускі і ўкраінскі. Бацька меў толькі двухгадовае навучанне ў царкоўна-прыхадскім вучылішчы. Маці была непісьменнай. Іх сын вучыўся ў мясцовай сямігодцы. У час летніх канікулаў ахвотна працаваў у калгасе.

Стаць настаўнікам хлапчук не збіраўся. Пасля сямігодкі спрабаваў паступіць на рабфак, каб затым атрымаць вышэйшую адукацыю. Але ў прыёмнай камісіі дакументы ад яго не прынялі: не споўнілася шаснаццаці гадоў. Вымушаны быў пайсці ў Рэчыцкае педвучылішча. Затым навуку спасцігаў у Рагачоўскім настаўніцкім інстытуце і Гомельскім пединстытуце імя В.П.Чкалава. Па заканчэнні апошняга атрымаў "чырвоны" дыплом.

Сваім вогненным дыханнем не абышла вясковага хлопца і Вялікая Айчынная вайна: удзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Мае баявыя ўзнагароды.

Пасля дэмабілізацыі былы воін працаваў настаўнікам, дырэктарам школ, у тым ліку і ў сваёй роднай Шарпілаўцы. Дарэчы, яшчэ са школьнай парты пачаў пісаць вершы, і гэта захапленне не прайшло бясследна. У маладосці займаўся журналістыкай, а незадоўга да свайго юбілею выпусціў зборнік паэзіі "На перекрестках жизни".

З 1955 года Іван Фёдаравіч няспынна працуе ў Гомелі — спачатку ў пединстытуце, а з 1969 года ў створаным на яго базе дзяржаўным універсітэце, дзе стаў доктарам навук, прафесарам, акадэмікам, заслужаным дзеячом навукі Беларусі. Нельга не зазначыць, што І.Ф.Харламаў пасля вядомага педагога П.Я. Панкевіча, які быў першым у Беларусі доктарам педагагічных навук (1929г.) і акадэмікам АН БССР у гэтай галіне (1931г.), з'явіўся другім беларускім педагогам, удастоеным такіх высокіх навуковых тытулаў.

За 45 гадоў плённай працы І.Ф.Харламавым апублікавана звыш 300 навукова-педагагічных работ па тэарэтычных і метадычных пытаннях навучання і выхавання, у тым ліку 29 кніг. Яны выдадзены ў Беларусі, Маскве, Кітаі, Польшчы, Чэхаславакіі. Найбольш значнымі сярод іх з'яўляюцца: "Асноўныя пытанні арганізацыі выхаваўчай работы ў школе" (1967г.), "Тэорыя маральнага выхавання" (1972), "Як актывізаваць вучэнне школьнікаў" (1975), "Teoria mravnej vychovy" (Браціслава, 1975), "Маральнае выхаванне школьнікаў" (1983), "Этычныя гутаркі з вучнямі" для IV, V, VI, VII і VIII класаў (1982-1987), а таксама падручнік "Педагогіка" для студэнтаў універсітэтаў і педагагічных інстытутаў. У 1979 годзе ён быў выдадзены ў Мінску з грыфам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, а ў 1990 годзе — у Маскоўскім выдавецтве "Высшая школа" і з таго часу ўжо вытрымаў сем перавыданняў, у тым ліку ў Расіі і Кітаі. Гэта сведчыць аб высокай якасці названага падручніка, які ў 1996 годзе быў апублікаваны і на беларускай мове.



Навукова-метадычныя артыкулы педагога-наватара рэгулярна друкуюцца ў расійскіх і беларускіх часопісах і навуковых зборніках і нязменна выклікаюць вялікую цікавасць. Але вынікова і навуковая каштоўнасць прац вучонага вызначаецца не колькасцю публікацый, а навізной і арыгінальнасцю сваіх тэарэтычных і метадычных ідэй.

Праз усе працы вучонага праходзіць ідэя аб неабходнасці зрабіць навучанне эфектыўным сродкам развіцця і выхавання падрастаючага пакалення. Шлях да гэтага адзін — навукова абгрунтаваная арганізацыя вучэбна-выхаваўчай дзейнасці вучняў як на ўроках, так і ў сістэме дамашніх заняткаў. Ён раскрыў псіхолага-педагагічныя механізмы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якія забяспечваюць высокую эфектыўнасць навучання. Вельмі даступна гэта пытанне асвятляецца ў яго кнізе "Як актывізаваць навучанне школьнікаў", у апублікаваных ім дапаможніках і падручніках па педагогіцы.

Цяпер акадэмік І.Ф.Харламаў не пакідае без увагі тую паспешлівасць і тыя шматлікія навукова-педагагічныя скажэнні, якія дапускаюцца ў пачатым рэфармаванні школьнай адукацыі.

Шырокавядомай з'яўляецца высокая патрабавальнасць Івана Фёдаравіча да дысертацыйных даследаванняў саіскальнікаў кандыдацкіх і доктарскіх вучоных ступеняў пры іх разглядзе ва ўзначальваемым ім Экспертным савеце па педагагічных навуках Вышэйшага атэстацыйнага камітэта Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы яго намаганням планка гэтых патрабаванняў у апошні час значна павысілася.

Уся навукова-педагагічная дзейнасць акадэміка І.Ф.Харламава, грунтоўнасць і фундаментальнасць распрацоўваемых ім тэарэтычных і метадычных ідэй па праблемах навучання і выхавання забяспечылі яму вядучую ролю і высокі навуковы аўтарытэт не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў краінах блізкага і далёкага замежжа. Ён працягвае весці актыўную выкладчыцкую працу ў Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Ф.Скарыны і займаецца плённай даследчыцкай дзейнасцю. Пажадаем жа яму ў дні яго юбілею моцнага здароўя, далейшых творчых поспехаў, захавання той вялікай энергіі і нестамляльнасці, якія ён праяўляе ў развіцці педагагічнай навукі.

**Л.ШАМЯТКОЎ,**
**член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.**

**Належыць пяру юбіляра**: кніг — 29; брашур — 18; артыкулаў і тэзісаў у зборніках — 54; артыкулаў у часопісах — 79; навукова-метадычных артыкулаў у газетах — 90; грамадска-публіцыстычных артыкулаў у газетах — 40.

## І.ФХАРЛАМАЎ: ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

**1938**
Скончыў Рэчыцкі педагагічны тэхнікум. Працаваў літработнікам Рэчыцкай раённай газеты "Зара камуны".

**1939**
Дырэктар Карпаўскай сямігадовай школы Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці.

**1945**
Дырэктар Хомінскай сямігадовай школы Лоеўскага раёна.

**1949**
Дырэктар Крупейскай васьмігадовай школы Лоеўскага раёна.

**1950**
Загадчык Лоеўскага раённага аддзела народнай адукацыі.

**1951**
Дырэктар Шарпілаўскай сярэдняй школы Лоеўскага раёна.

**1952**
З адзнакай завочна скончыў літаратурны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава.

Паступіў на стацыянарнае навучанне ў аспірантуру па педагогіцы ў Мінскі пединстытут імя А.М.Горкага.

**1955**
Старшы выкладчык кафедры педагогікі Гомельскага пединстытута імя В.П.Чкалава.

**1956**
У Маскоўскім абласным пединстытуце абаронена дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

**1961**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 верасня ўзнагароджаны медалём "За працоўную адзнаку".

**1962**
Загадчык кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гомельскага пединстытута імя В.П.Чкалава.

**1963**
Прарэктар па вучэбнай рабоце Гомельскага пединстытута імя В.П.Чкалава.

**1969**
Старшы навуковы супрацоўнік Гомельскага пединстытута імя В.П.Чкалава.

**1972**
5 кастрычніка на вучоным Савеце НДІ агульнай педагогікі АПН СССР па манаграфіі "Тэорыя маральнага выхавання" абаронена доктарская дысертацыя.

У лістападзе быў уведзены ў састаў рэдакцыйнай калегіі часопіса "Народная асвета".

**1973**
4 сакавіка на агульным сходзе АПН СССР выбраны членам-карэспандэнтам Акадэміі педагагічных навук СССР.

7 верасня Прэзідыумам ВАКа прысуджана вучоная ступень доктара педагагічных навук.

У кастрычніку рашэннем Дзяржаўнага Камітэта СССР па народнай адукацыі прысвоена вучонае званне прафесара.

**1975**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 24 студзеня ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**1976**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 сакавіка ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**1977**
Прымаў удзел у рабоце III канферэнцыі педагогаў сацыялістычных краін, якая праходзіла ў Варшаве.

**1978**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 3 мая ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**1980**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

**1983**
У эстонскім выдавецтве "Валгус" выходзіць кніга ў перакладзе на эстонскую мову "Этычныя гутаркі з вучнямі" (Мн.: Нар. асвета, 1977).

Прысвоена ганаровае званне "Лаўрэат V Скарынаўскіх навуковых чытанняў 1983 года".

У Пекіне на кітайскай мове выйшла кніга "Педагогіка. Курс лекций".

**1988**
Быў дэлегатам Усесаюзнага з'езда работнікаў народнай адукацыі.

**1990**
15 сакавіка на агульным сходзе Акадэміі педагагічных навук СССР выбраны сапраўдным членам АПН СССР.

За комплекс вучэбна-метадычнай літаратуры ў дапамогу настаўніку атрымаў сярэбраны медаль ВДНГ.

**1995**
У сакавіку на агульным сходзе Акадэміі навук Беларусі выбраны сапраўдным членам Акадэміі навук Беларусі.

**1998**
Выйшаў зборнік вершаў "На перекрестках жизни. Стихи разных лет".

**И.ХАРЛАМОВ**

### *СЛОЖИТЬ БЫ ПРОЖИТЫЕ ГОДЫ...*

*Сложить бы прожитые годы,*
*Какой была бы высота*
*Из ясных дней*
*И непогоды,*
*Когда осенний дождь*
*Хлестал!..*

*Какою выросли бы глыбой,*
*Незримо уходя в зенит,*
*Укор содеянных ошибок,*
*Боль незаслуженных обид!*

*И все ж, под тучи поднимаясь*
*Стремниной отошедших лет,*
*Немало жизнь моя простая*
*Познала счастья*
*И побед...*

*Я пробивался*
*К ним работой,*
*Ни сил,*
*Ни пота не щадя.*
*И жил всегда*
*Одной заботой,*
*Чтоб крепла*
*Родина моя.*

*И чтоб ее*
*Светились дали,*
*Хранил в душе*
*Я отсвет рос*
*И никогда свои печали*
*Ей с тайным умыслом*
*Не нес.*

### Кнігі вучонага





У 1979 годзе выдавецтва "Універсітэцкае" (Мінск) выпусціла курс лекцый прафесара І.Ф.Харламава па педагогіцы, які быў рэкамендаваны Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў універсітэтаў і пединстытутаў. Гэтыя лекцыі, па прызнанні самога вучонага, ён падрыхтаваў ад незадавальнення тымі вучэбнымі дапаможнікамі, якімі ў той час карысталіся выкладчыкі і студэнты па педагогіцы. Разам з тым ён працягваў удасканальваць як структуру, так і навуковы змест выкладаемага матэрыялу ў першым выпуску курса сваіх лекцый. Вынікам гэтай работы з'явілася выданне ў 1983 годзе дапаможніка ўжо масавым тыражом у Маскве (выдавецтва "Высшая школа") з грыфам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, якім сталі карыстацца студэнты ўсіх універсітэтаў і пединстытутаў краіны.

Аднак І.Ф.Харламаў не спыняў сваіх намаганняў у паг-

## НА АСНОВЕ

лыбленні тэарэтычных асноў дапаможніка і паляпшэнні яго метадычных якасцей. У 1996 годзе ў значна перапрацаваным выглядзе ён выдаецца ў Мінску на беларускай мове ў якасці падручніка для студэнтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў. Затым у 1998 і 2000 г.г. падручнік выпускаецца ў Мінску на рускай мове. У 1997, 1999 і 2000 г.г. ён выходзіць у Маскве з грыфам Міністэрства агульнай і прафесіянальнай адукацыі Расійскай Федэрацыі. Усё гэта з'яўляецца не толькі паказчыкам высокіх якасцей падручніка і яго шырокай папулярнасці сярод студэнтаў і выкладчыкаў вну, але і вялікім поспехам самога вучонага.

Нельга не адзначыць тых навацыйных новаўвядзенняў, якімі характарызуецца кожны выпуск падручніка. Яны перш за ўсё бачны ў больш абгрунтаваным вызначэнні важнейшых паняццяў педагагічнай навукі. Аўтар, напрыклад, пераасэнсоўвае сам прадмет даследавання педагогікі. Ён паказвае, што гэтым прадметам з'яўляецца не выхаванне як педагагічная дзейнасць, як гэта часам прынята лічыць, а працэс мэтанакіраванага развіцця і фарміравання растучай асобы ва ўмовах спецыяльна арганізаванага выхавання. Толькі ведаючы сутнасць і заканамернасці развіцця асобы, можна распрацоўваць тэарэтычныя і метадычныя асновы выхавання як сродку гэтага развіцця.

А возьмем сутнасць такіх складанейшых паняццяў, як выхаванне і навучанне. Няўжо не прымітыўна гучыць, калі ў некаторых вучэбных дапаможніках выхаванне разглядаецца

# ПІСЬМЕННІК ДАЎ СПРАВАЗДАЧУ ЗЕМЛЯКАМ



Напрыканцы мінулага месяца на філалагічным факультэце адбылася творчая імпрэза, якая, несумненна, для кожнага з яе ўдзельнікаў сталася падзеяй. Прысвечана яна была святкаванню 60-й гадавіны з дня нараджэння знакамітага дзіцячага пісьменніка і грамадскага дзеяча Уладзіміра Сцяпанавіча Ліпскага. Ураджэнец вёскі Шоўкавічы Рэчыцкага раёна, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" прыехаў са сталіцы, каб, па яго ўласных словах, "даць справаздачу землякам" за той час, што правёў па-за роднымі мясцінамі.

А спавядацца цяперашняму старшыні Беларускага дзіцячага фонда давялося перад паўнюткай залай, куды сабраліся сябры, калегі, аматары творчасці У.Ліпскага, а таксама студэнты і выкладчыкі ГДУ імя Ф.Скарыны. Сустрэчу вёў часты госць філалагічнага факультэта, сакратар Гомельскага абласнога аддзялення СП Беларусі Васіль Ткачоў, чые дасціпныя жарты дапамагалі трымаць цікавасць аўдыторыі на працягу дзвюх гадзін. Нават не цікавасць. Хутчэй слова "захапленне" можа перадаць тую эмацыянальную атмасферу, якая панавала на вечарыне. Спакойная разважлівасць і ў той жа час інтанацыйная ўзрушанасць, добры гумар, чалавечая і мужчынская абаяльнасць У.Ліпскага паланілі ўсіх з першых жа хвілін. Нездарма ў ладнай частцы віншаванняў і пытанняў з залы адзначалася менавіта любоў, каханне, тая галоўная якасць, што, відаць, з'яўляецца дамінантай у жыцці і творчасці нашага земляка. Як пяшчотна распавядаў пісьменнік пра сваіх дзяцей і ўнукаў! А як непадробна хваляваўся, быццам упершыню выступаў на сцэне!

Доказам добразычлівасці і шчырага сяброўства У.Ліпскага можа служыць і той факт, што віншаваць яго прыехалі і ягоны школьны настаўнік (уявіце ўзрост!), якому аднакласніца У.Ліпскага тут жа на сцэне прызналася ў тым, што калісьці ўвесь клас спісваў матэматыку ў будучага творцы, і супрацоўніцы газеты "Гомельская праўда", якія так і не здолелі адказаць на пытанне, чаму іх выданне друкуе пераважна рускамоўныя артыкулы; і гомельскі паэт, выкладчык кафедры беларускай літаратуры, Віктар Ярац, і многія-многія іншыя.

Дзякуючы добрым, сардэчным словам як у адрас, так і з боку юбіляра, сустрэча, на шчасце, не атрымалася афіцыёзнай і не сталася чарговай фармальнай працэдурай уручэння падарункаў "на роднай зямлі". Шкада толькі, што недахоп часу не дазволіў атрымаць большую асалоду ад слухання твораў У.Ліпскага ў выкананні аўтара, а таксама болей даведацца пра штогадовы Усебеларускі фестываль смеху ў Аўцюках, ініцыятарам правядзення і старшынёй журы якога з'яўляецца ўсё той жа нястомны У.Ліпскі.

Напрыканцы сустрэчы расчулены пісьменнік падараваў за лепшае пытанне шчаслівчыку з залы сваю апошнюю кнігу "Каралева белых прынцэс". Гэтае шыкоўнае выданне, якое аўтар прысвяціў сваім дзецям і ўнукам, а таксама "усім дзеткам Беларусі", атрымаў і філалагічны факультэт. Сюды ж У.Ліпскі перадаў і свае іншыя вядомыя кнігі: "Я: праўдзівы аповед пра твой і мой радавод" і "Мама (малітва сына)". Апошняя, дарэчы, вельмі шырока рэкламавалася ў рэспубліканскім друку і на тэлебачанні. На развітанне ў кнізе ганаровых гасцей творца запісаў: "Святочна ўзрушаны, усхваляваны ад справаздачы перад землякамі. Хай кожны дзень Вашага жыцця будзе святам. Беражыце Мову, шануйце нашу мілую Беларусь!"

Падзякуем і мы таленавітаму земляку за незабыўныя ўражанні ад дакранання да яго светлай па-дзіцячы чыстай асобы, аптымізм і незгасальная вера якой незлічонымі знічкамі запалілі ўсю залу, а таксама пажадаем пісьменніку поспехаў на прафесійнай глебе, а бацьку і дзеду -—спакою і дабрабыту ў сям'і.

**Ю.САЛЬНІКАВА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

**<u>На здымку:</u> выступае Уладзімір Ліпскі.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# БАГАТАГА ВОПЫТУ

як працэс уздзеяння на фарміруемую асобу з мэтай прывіцця ёй тых або іншых якасцей? Немагчыма таксама зразумець, у чым сутнасць навучання, калі яно трактуецца як працэс узаемадзеяння настаўніка і вучняў па аваладанні апошнімі вывучаемым матэрыялам.

У навуковай педагогіцы пытанні выхавання і навучання разглядаюцца з пункту гледжання дзейнасна-адносіннай метадалагічнай канцэпцыі. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што развіццё асобы адбываецца толькі тады, калі яна ўключаецца ў разнастайныя віды дзейнасці (пазнавальную, працоўную, патрыятычную і г.д.) па аваладанні грамадскім вопытам і праяўляе станоўчыя адносіны і высокую актыўнасць у гэтай дзейнасці. Тады і для студэнта, і для настаўніка становіцца зразумелым, што выхаванне нельга зводзіць да так называемага педагагічнага ўздзеяння на дзяцей. Для яго ажыццяўлення трэба ўключаць вучняў у разнастайныя віды дзейнасці і стымуляваць іх асабістую актыўнасць у разумовым, сацыяльна-грамадзянскім, патрыятычным і маральна-эстэтычным развіцці. І навучанне тады лагічна трактаваць як працэс арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і стымулявання іх актыўнасці ў авалодванні вывучаемым матэрыялам, у развіцці сваіх разумовых і творчых здольнасцей.

Падобнай яснасці і абгрунтавання сутнасці ўказаных педагагічных працэсаў у дапаможніках іншых аўтараў мы не знаходзім.

Цяжкай тэарэтычнай і метадычнай праблемай педагогікі з'яўляецца забеспячэнне паспяховасці вучэбнай работы вучняў. Каму не вядома, што многія вучні не засвойваюць матэрыял на ўроках і не могуць выконваць дамашнія вучэбныя заданні? На нядаўняй рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі, якая праводзілася ў Гомелі па пытаннях укаранення ў школах інавацыйных абучаючых методык, зазначалася, што ад 20 да 40% вучняў не аваладваюць вывучаемым матэрыялам. У падручніку І.Ф.Харламава не толькі раскрываюцца прычыны гэтага сур'ёзнага недахопу, але і асвятляюцца шляхі яго пераадольвання.

Аўтар указвае, што для засваення вывучаемага матэрыялу неабходна, каб вучні выконвалі поўны цыкл вучэбна-пазнавальных дзеянняў: пярвічнае і далейшае яго ўспрыманне і асэнсаванне, праводзілі работы па яго актыўнаму запамінанню, прымяненню творчых ведаў на практыцы і далейшаму іх паўтарэнню, паглыбленню і замацаванню.

Але нават пры самым якасным навучанні і трывалым авалодванні вывучаемым матэрыялам дасягаецца толькі абучанасць вучняў. А.С.Макаранка сцвярджаў, што нават пры самай высокай абучанасці і ўмеласці асоба можа быць непаўнацэннай, калі ў яе не сфарміраваны здаровыя сацыяльныя і духоўныя адносіны. Фарміраванне такіх адносін выдатны педагог лічыў "сапраўдным аб'ектам нашай выхаваўчай работы". У падручніку І.Ф.Харламава гэтай важнай праблеме прысвечаны спецыяльны раздзел "Выхаванне як працэс асобаснага развіцця вучняў і яго даследаванне ў педагогіцы".

Вызначыўшы адносіны як эмацыянальна-інтэлектуальнае перажыванне асобай тых сувязей, якія ўстанаўліваюцца паміж ёй і іншымі людзьмі, а таксама рознымі з'явамі і падзеямі акаляючага жыцця, аўтар адзначае, што калі гэтыя адносіны замацоўваюцца і становяцца звычайнымі, яны вызначаюць устойлівасць паводзін чалавека ў любых зменлівых умовах і пераўтвараюцца ў асобасныя якасці. Такім чынам, каб зрабіць асобу выхаванай, трэба фарміраваць у яе адпаведныя асобасныя ўласцівасці і якасці (грамадзянскасць, патрыятызм, працалюбства, патрабавальнасць да сябе, прынцыповасць, таварыскасць, калектывізм і г.д.).

Але як жа можна іх фарміраваць? У падручніку раскрываецца, што асобасныя якасці ўключаюць у сябе такія структурныя кампаненты, як патрэбнасна-матывацыйная сфера, веданне сутнасці і спосабаў праяўлення гэтых якасцей, погляды і перакананні, а таксама навыкі і звычкі паводзін. Асэнсаванне метадычных асноў фарміравання ўказаных структурных кампанентаў дазваляе дастаткова эфектыўна ажыццяўляць выхаванне асобасных якасцей.

Падручнік адрозніваецца вялікай тэарэтычнай і метадычнай грунтоўнасцю і глыбінёй. Гэта не толькі належным чынам вянчае шматгадовую працу вучонага, але і робіць гонар нашаму універсітэту, у якім ён безупынна працуе ўжо каля 45 гадоў.

**Ф.КАДОЛ,**
**дацэнт кафедры педагогікі.**

# СТРАНА, ГДЕ ЕСТЬ ЧЕМУ ПОУЧИТЬСЯ

**(Окончание. Начало в №№ 8,10)**

**ОХРАНА ТРУДА**

Из 52 недель — рабочих в Дании 45.

Охране труда уделяется серьезное внимание. Созданы центры по охране труда, которые финансируются за счет выполнения заказов от предприятий. В каждом амте таких центров 8-10. Они занимаются оказанием услуг по контролю за соблюдением техники безопасности, безопасных условий труда работников: правильное освещение и обустройство помещения, работа с вредными веществами, изучение и выработка рекомендаций по правильному положению тела человека во время работы и т.д.

На каждом предприятии создана специальная организация, отвечающая за охрану труда, члены которой избираются из числа работающих, если на предприятии более 6 работников. За охраной труда следят и профсоюзы.

**КОРОЛЕВСКАЯ СЕМЬЯ**

Большим уважением датчан пользуется королевская семья. Чаще всего монархами в Дании были женщины. Королева сейчас выполняет чисто представительские функции законодательной и исполнительной власти. Королева утверждает законы (но не утвердить не имеет права), министров — каждый из них перед вступлением в должность должен придти на прием к королеве, открывает заседания парламента после каникул.

Датчане гордятся историей королевской семьи, внимательно следят за ее успехами.

Все члены королевской семьи проживают на королевской площади. У каждого своя резиденция. Присутствие одного из них дома можно заметить по поднятому флагу, в отсутствие - флаг спускается. Любой гражданин может прогуляться по королевской площади, но время на это датчане не тратят. Когда наша группа обозревала симпатичных лейбгвардейцев — ни одного датчанина на площади не было. Охрана представляет собой пост и одного лейбгвардейца у каждой резиденции.

В Дании нет традиции охранять королевскую семью. Считается: чем меньше охраны, тем меньше интерес окружающих. Обычно за королевой далеко позади идет один человек охраны.

Датчане любят свою королеву. Она хорошо рисует, вышивает. По образованию — историк-археолог. Однако выпускных экзаменов не сдавала. Видимо, во времена ее молодости не принято было члену королевской семьи перед кем-то держать экзамен. Первый в семье, кто получил диплом, — ее сын Фредерик X.

**АРМИЯ**

Весьма специфично отношение датчан к армии. Срок службы в армии — 9 месяцев. Ходят слухи, что его будут сокращать до 8 месяцев. Датчане считают: поскольку их страна небольшая, то в случае нападения все равно защитить себя не сможет. Поэтому особой необходимости, по их мнению, в национальной армии нет.

Однако королевский сын прошел усиленную военную подготовку, сдал экзамены на подводника-спецназовца, чем гордится и мать-королева, и вся Дания.

Подъехав к границе Дании и Германии в воскресенье, наша делегация долго ожидала пограничника, который должен дать "добро" на наш выезд из страны. Как законопослушные граждане мы сначала сидели в автобусе, затем ходили вокруг пограничной будки, - никого не было. Решили, что в воскресенье никто не работает. Очень уж хотелось домой, поэтому, никого не дождавшись, пересекли границу без разрешения. Затем на германо-польской границе пограничник не хотел нас пропускать дальше — не было (и не могло быть) отметки о том, что мы пересекли границу Дании и Германии.

**ИНТЕРЕСНО**

Ни одна организация, в которых мы были, не "хвасталась" цифрами. На наши вопросы: сколько, какой процент и т.п., везде отвечали: "Зачем? Если будет надо, мы посчитаем". Видимо, не для процентов работают.

Никаких партий зеленых или подобных организаций в Дании нет. Однако есть министерство экологии. Каждое предприятие должно заботиться о поддержании нормального экологического баланса. У датчан странное отношение к зеленым насаждениям. Если ранее Дания была страной огромных территорий лесов, то сейчас леса почти не осталось. На наше предложение посадить в городе Вайле на пустующих территориях жилых массивов побольше деревьев и других зеленых насаждений нам отвечали: "А где будут детские площадки, где играть детям?" Будто дерево может помешать игре. В жилом районе Вайле на проезжей части нет знаков, ограничивающих скорость движения автотранспорта. Прямо на середине проезжей части через каждые метров 100 разбиты клумбы у правой и левой стороны поочередно. Таким образом, водитель не в состоянии разогнать свой автомобиль и ехать с большой скоростью, поскольку постоянно должен лавировать между этими клумбами.

У многих магазинов стоят детские велосипеды, машинки, лошадки, другие игрушки. В супермаркетах обязательно расположены детские столики с конструкторами LEGO. Пока мама ходит по магазинам и делает покупки, ребенок находит себе занятие.

Чтобы не создавалось столпотворений, у небольших магазинчиков часто можно встретить прямо на улице лотки с товарами. Выбирай, что хочешь, потом иди в магазин, ищи продавца и плати деньги.

Достаточно дорого стоит свежая рыба, несмотря на то, что страна окружена морем. Оказывается, дороговизна связана с тем, что свежая рыба — это рыба, выловленная вчера. Деньги берут за скорость доставки на прилавок.

Во всех учреждениях и организациях, которые мы посетили, на видных местах стоят термосы с кофе и чаем. Хочешь, наливай и пей. Обязательно есть помещения, где можно передохнуть и пообедать.

За время нахождения в Дании мы познакомились со многими интересными людьми, увлеченными своим делом. Однако не меньшей ценностью стало и узнавание по-новому участников нашей группы: очень интересный рассказчик, увлеченный историей В.С.Селицкий; любитель тенниса и стихов Г.С.Митюрич; замечающая даже самые мелкие особенности местной архитектуры В.М.Лебедева. Каждый был своеобразен и неповторим. Это во многом оказывало свое влияние и на восприятие окружающего мира. Мы не замечали почти постоянно моросящего дождя, с юмором воспринималась порой весьма своеобразная датская кухня, незаметно пролетали сутки пребывания в автобусе (туда и обратно мы провели в нем около 4 суток).

Нам очень понравилась маленькая и удивительная страна, население которой составляет всего 5,5 млн. (в два раза меньше нашего государства!), в которой очень многое сделано с заботой о человеке и для человека.

**И.ЭСМАНТОВИЧ,**
**доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин юридического факультета.**



*Кожны адпачывае па-свойму. Прага. Карлаў мост.*
Фота У.ЧЫСЦІКА.

*У рэдакцыйнай пошце – паэзія*



Ірына ЛАРЫЁНАВА,
студэнтка 1-га курса
філалагічнага факультэта

## РОДНАЯ МОВА

*Як можна забыцца*
*На гэтыя словы:*
*"Матуля", "жыццё",*
*"Беларуская мова"?..*

*Радзіма — куточак,*
*Дзе ты нарадзіўся!*
*Чаму ж ты на родную*
*Мову забыўся?*

*Вучылі ж і ў школе,*
*І бацька, і маці*
*Любіць сваю мову,*
*Яе паважаці.*

*А ты растаптаў*
*Гэту мову і знішчыў —*
*На месцы яе*
*Засталось папялішча.*

*Ад мовы бацькоў — не адракуся.*
*Што я беларуска — я ганаруся!*

Таня КОЗАЧЕНКО

## ПОЭТУ

*Любовь нужна? Что за слова,*
*О чем задумался поэт?*
*И разве мог предположить,*
*Что кто-то скажет "Нет"?*
*Ты задаешь мне этот вот вопрос,*
*А я молчу,*
*Об этом говорить я не хочу.*
*Но если интересен мой ответ,*
*В глаза мои ты загляни, поэт.*
*Они тебе покажут целый свет,*
*А может и твои глаза, поэт...*
*В них будут звезды и костер в ночи,*
*Не надо слов — ты просто помолчи.*
*Там яркий свет свечи заспорил с бледною луной,*
*Она одна, а он уходит вместе с мглой,*
*"Нужна ли им любовь?" — опять заспоришь ты со мной.*
*Прислушайся внимательней в ночную тишь.*
*Она вдруг прокричала в мглу:*
*"Малыш, услышь, люблю, люблю"...*
*И быстрые шаги остановились впереди.*
*Он обернулся и в глаза ее взглянул,*
*К ней быстро ринулся и к телу нежному прильнул.*
*И лишь слова любви в ту ночь звучали,*
*Ну а природа и весь мир восторженно молчали.*
*Вот это все, как воздух всем необходимо,*
*Все остальное в этом свете минуло.*
*И если ты, поэт, внимательно смотрел в глаза,*
*То ты увидел звезды и костер в ночи,*
*Два нежных тела озаренных пламенем свечи,*
*А главное ты смог понять,*
*Как хочется тебе свою любовь отдать.*

Паўлюк МІЦКЕВІЧ,
выпускнік журналісцкага
класа СШ № 44

## ГІМН МОЛАДЗІ

*Ты — малады. Прыйшоў твой час!*
*Зірні наўкол — паходня кліча.*
*Пакуль жыцця прамень не згас —*
*Ляці да золку вольным знічам!*

*Будуй свой свет — тут ты ўладар.*
*Змяніць свой лёс — у тваіх руках!*
*Шануй свой край, як неба дар,*
*Чыні да шчасця новы шлях!*

*Хварэй рамантыкай, кахай,*
*Не будзь такім жа, як усе.*
*Наперад крок, не адступай,*
*Калі ўвесь свет супроць цябе...*

*Ты рок-музыка ці паэт —*
*Час не чакае, ён як дым.*
*Табе ён піша запавет:*
*"Ты малады — дык будзь жа ім!"*

Приглашает лаборатория прикладной психологии

## ЗДЕСЬ ВАМ ПОМОГУТ

***Дорогие друзья!***

На базе лаборатории прикладной психологии для студентов и преподавателей университета осуществляется:

- психологическое консультирование;
- психологические семинары по актуальной проблематике;
- тренинги личностного и профессионального роста.

***Вам предоставляются возможности:***

- расширить границы самопознания, исследовав особенности своего темперамента, характера, интеллекта, эффективной самореализации в профессиональной деятельности;
- получить профессиональную психологическую помощь в разрешении конфликтных ситуаций, в преодолении личностных затруднений, деструктивных психологических защит, которые создают препятствия в успешной реализации себя в жизни и профессиональной деятельности.

За период с января 2000 года на базе лаборатории было проведено 15 разнообразных тренинговых программ (по управлению стрессом, по телесноориентированной психотерапии, расширению творческого потенциала, эффективного общения, по конфликтологии, техникам релаксации, по менеджменту, развитию лидерских умений и т.д.), в которых приняло участие более 200 студентов университета. Проведение тренинговых программ продолжается (еженедельно по субботам с $10^{00}$). Для участия в семинаре-тренинге необходимо записаться в рабочую группу за неделю по тел. 57–94–79, либо непосредственно в лаборатории.

Консультирование осуществляется ежедневно с $10^{00}$ до $17^{00}$.

На базе лаборатории работает также психологический театр.

Ждем вас!

**Наш адрес:** Гомель, ул. Советская 98, санаторий-профилакторий университета, лаборатория прикладной психологии, к.3–1.

**Г.ГАТАЛЬСКАЯ,**
**зав. научно-учебно-практической лабораторией прикладной психологии.**

## СПОРТ СПОРТ СПОРТ



### ЛЕТНЯЯ "СЕСІЯ ЛЁГКААТЛЕТАЎ"

У сталіцы нашай рэспублікі прайшоў летні чэмпіянат сярод вну па лёгкай атлетыцы. Каманда ГДУ, у састаў якой увайшлі студэнты факультэта фізічнай культуры, набрала 498 ачкоў і заняла II агульнакамандные месца, уступіўшы толькі спартсменам АФВіС.

У кіданні дыска з вынікам 58.19 м, які значна перавышае нарматыў майстра спорту, перамагла студэнтка 4 курса Людміла Старавойтава.

У бар'ерным бегу Уладзімір Касцючык (110 м з/б) і Тацяна Жаўнова (100 м з/б) сталі першымі з "майстарскім" вынікам і прынеслі камандзе дадатковыя прызавыя ачкі.

Дружная эстафетная каманда ў саставе У.Аліева, А.Фешчанка, А.Салошыка, П.Барабанава не пакінула ніякіх надзей сапернікам у эстафеце 4х400 м.

Сярэбранымі прызёрамі спаборніцтваў сталі Л.Старавойтава (ядро), А.Фешчанок (800 м), С.Белуш (20 км с/х), С.Хурбатаў (трайны), А.Гаўрычэнка (3000 м з/п), В.Касцючык (шэст).

На трэцюю прыступку п'едэстала гонару падняліся Т.Жаўнова (вышыня), Н.Міхан (даўжыня, трайны), К.Кірава (800 м), У.Аліеў (200 м), С.Хурбатаў (даўжыня), А.Фешчанок (1500 м).

Трэба адзначыць, што ўсе ўдзельнікі нашай каманды, нягледзячы на дажджлівае і халоднае надвор'е, змаглі сабрацца і паказаць добрыя для такіх умоў вынікі.

Каманду лёгкаатлетаў рыхтавалі трэнеры-выкладчыкі кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту і аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры Ю.П. Працко, С.В.Сеўдалёў, Ю.І.Сакалоў, У.С.Лемяшкоў, І.Л.Сівадзедаў, Г.І.Нарскін, Ф.У.Чарапкоўскі.

**М.КАНЯХІН,**
**заг.кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, к.п.н, дацэнт.**



## ВСЯ МОЛОДЕЖЬ ПОД УГРОЗОЙ СПИДА

**Согласно оценки Объединенной программы ООН по ВИЧ/СПИД и Всемирной организации здравоохранения к концу 1999г. в мире насчитывалось 33,6 млн. ВИЧ-инфицированных. С начала эпидемии от СПИДа умерло 16,3 млн. человек, в том числе 2,6 млн. в 1999г.**

**В государствах СНГ, по числу случаев ВИЧ-инфекции, на 1-м месте Украина — более 30000 случаев, на 2-м — Россия — более 22000 случаев и на 3-м — Беларусь. На 1.04.2000г. в Республике Беларусь зарегистрировано 2907 случаев ВИЧ-инфекции, в т.ч. в Гомельской области — 2179 или 75%.**

Около половины случаев ВИЧ-инфицирования приходится на людей в возрасте от 15 до 24 лет, когда большинство из них начинают половую жизнь. Социальный статус ВИЧ-инфицированных неоднороден, однако, преобладающей группой являются лица без определенного рода деятельности — 52,4%, контингент следственных изоляторов — 20,5%.

По-прежнему ведущим является путь заражения через кровь среди наркопотребителей — при совместном внутривенном введении наркотиков — 66%. В то же время передача инфекции при половых контактах идет по нарастающей.

За период эпидемии в области взято на учет 225 ВИЧ-инфицированных беременных женщин, из них родило 92. Из 48 обследованных детей у 9-ти подтвержден диагноз ВИЧ-инфекции, которую они получили от матери.

Умерло ВИЧ-инфицированных в области — 55, в том числе от СПИДа — 3.

Пока еще ВИЧ/СПИД можно назвать "невидимой эпидемией". У большинства зараженных инфекция не развилась в симптоматический СПИД и не стала причиной рецидивирующих болезней, приводящих на фоне иммунодефицита к смерти. Как правило, вирус годами распространяется тайно.

Прогноз дальнейшего развития эпидпроцесса в Гомельской области остается неблагоприятным. ВИЧ проникает в новые группы наркопотребителей. Таким образом, вероятность непрерывного распространения ВИЧ-инфекции через введение наркотиков и практику незащищенного (без презерватива) секса становится несомненной.

Помимо ВИЧ-рискованного поведения, связанного с использованием общих шприцев, игл среди шприцевых наркопотребителей, алкоголь и другие наркотики (неинъекционные) могут воздействовать на сексуальное поведение и повысить риск инфицирования молодых людей ВИЧ или другими СПБ. Чрезмерное употребление алкоголя снижает сдерживающие факторы, усиливает агрессию, уменьшает возможность использования полученной ранее информации и профилактике СПИДа и сводит к минимуму принятие решения о защите.

Будущее развития ВИЧ-эпидемии находится в руках молодых людей. Модели поведения, которые они выбирают сейчас и будут поддерживать в течение своей сексуально активной жизни, определяют ход эпидемии в грядущих десятилетиях. Исследования показывают, что молодые люди выбирают более безопасное сексуальное поведение, если обладают информацией, навыками и необходимыми средствами. Безопасное сексуальное поведение становится нормой среди молодежи в развитых странах.

В г.Гомеле с января 2000г. Белорусская Ассоциация клубов ЮНЕСКО внедрила проект "Изменение сексуального поведения (безопасный секс) населения Республики Беларусь". Задача проекта — изменение поведения молодежи и уязвимых групп населения в целях профилактики ВИЧ-инфекции и других СПБ. Информационный Центр "Шанс", созданный на базе Гомельского областного Центра профилактики СПИДа, ведет образовательно-профилактическую работу по вопросам ВИЧ/СПИД, других СПБ. В штат Центра "Шанс" входят гинеколог, венеролог, психолог и социальные работники, специализирующиеся по работе с целевыми группами проекта: молодежь, наркопотребители, мужчины, имеющие секс с мужчинами, и женщины секс-бизнеса.

По вопросам консультирования у специалистов, обследования на СПИД, в т.ч. анонимно, можно обращаться по тел.: 53-85-67; 53-71-40; 54-00-88 (психолог).

**Т.ЛЫСЕНКО,**
**зав. отделом профилактической работы Гомельского ОЦП-СПИД.**

Дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры оптыкі выказваюць глыбокае спачуванне ст.выкладчыку **СЕРГІЕНКУ** Міхаілу Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 700 экз.
Заказ 338
Падпісана да друку 16.06.2000 г.